Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

DOI:10.17951/sb.2022.16.221-235
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Natalia Snigiriova / Наталля Снігірова

National Academy of Sciences of Belarus, Minsk (Belarus)
e-mail: nataliasnigiriova@gmail.com
https://orcid.org/ 0000-0002-2083-1392

Фемінатыўныя варыянты як марфалагічныя інавацыі ў гаворках паўночна-ўсходняй Польшчы (на прыкладзе ізаморфы *kłomel f.*)

Feminative Variants as Morphological Innovations in the Dialects of North-East Poland (on the example of the isomorph kłomel f.)

Feminatywne warianty jako innowacje morfologiczne w gwarach północno-wschodniej Polski (na przykładzie izomorfy kłomel f.)

Abstract

Dialectal peculiarities in the functioning of the grammatical category of gender, characteristic of the north-eastern dialects of the Polish language, can be geographically and typologically correlated with the corresponding phenomena localized mainly in the north- and south-western Belarusian dialects – the areas of the individual feminine nouns continue in the East of the Polish language continuum.

Assuming that the centre of irradiation or the stimulus that caused the appearance of the morphological innovation *kłomel* (f.), noted in the North-East of Poland, is hypothetically located in Belarus, in the area of expansion of the Polesie dialects, the author presents some results of a comparative analysis of data regarding the variable category of gender in Polish, Belarusian and some other Slavic and non-Slavic languages, as well as linguistic-geographical, structural-semantic, etymological data regarding this areal innovation with available Slavic and non-Slavic material, which allows us to get closer to solving its origin and the reasons for its appearance in the north-eastern speeches of Poland, where the lexeme *kłomel* (f.) is formally related primarily to the masculine word structure and is used alongside the well-known feminine equivalent *kłomla*.

The research was conducted with the application of comparative, comparative-historical, descriptive-analytical and areal-typological methods. Their complex application leads to the conclusion that the Western Polesian-Panmonian word *klomla* should be interpreted as a stimulus phenomenon for the formation of the morphological innovation *kłomel* (f.) in the north-eastern dialects of the Polish language. The expansion of femininum in this case can be considered as the result of the redistribution of feminine and masculine forms in the inter-Slavic

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

and Baltic-Slavic contact zone, which in turn caused changes in morphology and corresponding mutations in the considered lexeme.

Keywords: area, contact zone, language influence, stimulus, expansion, innovation

Abstrakt

Gwarowe osobliwości w funkcjonowaniu gramatycznej kategorii rodzaju charakterystyczne dla północno-wschodnich dialektów języka polskiego mogą być skorelowane geograficznie i typologicznie z odpowiadającymi im zjawiskami zlokalizowanymi głównie w północno- i południowo-zachodnich dialektach białoruskich – areały poszczególnych rzeczowników rodzaju żeńskiego są kontynuowane na wschodzie polskiego kontinuum językowego.

Zakładając, że centrum irradiacji lub bodziec, który spowodował pojawienie się morfologicznej innowacji *kłomel* (f.) odnotowanej w północno-wschodniej Polsce hipotetycznie jest zlokalizowany na Białorusi, w obszarze rozpowszechniania się gwar poleskich autorka przedstawia wyniki analizy porównawczej danych dotyczących zmiennej kategorii rodzaju w języku polskim, białoruskim i niektórych innych językach słowiańskich i niesłowiańskich, a także dane językowo-geograficzne, strukturalno-semantyczne, etymologiczne dotyczące tej arealnej innowacji z dostępnym materiałem słowiańskim i niesłowiańskim, co pozwala zbliżyć się do rozwiązania jej genezy i przyczyn pojawienia się w gwarach północno-wschodniej Polski, gdzie leksem *kłomel* (f.) jest formalnie związany przede wszystkim ze strukturą wyrazów rodzaju męskiego i jest używany obok znanego odpowiednika rodzaju żeńskiego *kłomla*.

Badania przeprowadzono metodami: porównawczą, porównawczo-historyczną, opisowo-analityczną oraz arealno-typologiczną. Ich kompleksowe zastosowanie prowadzi do wniosku, że zachodniopolesko-poniemońskie słowo *klomla* należy interpretować jako zjawisko stymulujące powstawanie morfologicznej innowacji *kłomel* (f.) w północno-wschodnich gwarach języka polskiego. Ekspansję femininum można w tym przypadku uznać za wynik redystrybucji form żeńskich i męskich w międzysłowiańskiej i bałtycko-słowiańskiej strefie kontaktowej, co z kolei spowodowało zmiany w morfologii i odpowiednie mutacje w rozpatrywanym leksemie.

Słowa kluczowe: areał, strefa kontaktu, wpływ językowy, impuls, ekspansja, innowacja

Анатацыя

Дыялектныя асаблівасці ў функцыянаванні граматычнай катэгорыі роду, характэрныя для паўночна-ўсходніх гаворак польскай мовы, арэальна і тыпалагічна могуць быць суаднесены з адпаведнымі з'явамі, лакалізаванымі пераважна ў паўночна- і паўднёва-заходніх беларускіх гаворках – арэалы асобных назоўнікаў femininum маюць працяг на ўсходзе польскага моўнага кантынуума.

Мяркуючы, што цэнтр ірадыяцыі або стымул, які выклікаў узнікненне марфалагічнай інавацыі *kłomel* (f.), адзначанай на паўночным усходзе Польшчы, гіпатэтычна знаходзіцца на Беларусі, у зоне пашырэння палескіх гаворак, аўтар прадстаўляе некаторыя вынікі супастаўляльнага аналізу звестак адносна зменнай катэгорыі роду ў польскай, беларускай і некаторых іншых, славянскіх і неславянскіх, мовах, а таксама лінгвагеаграфічных,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

структурна-семантычных, этымалагічных дадзеных адносна гэтай арэальнай інавацыі з наяўным славянскім і неславянскім матэрыялам, што дазваляе наблізіцца да разгадкі яе паходжання і прычын з'яўлення ў паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы, дзе лексема *kłomel* (f.) фармальна суадносіцца ў першую чаргу са структурай слоў мужчынскага роду і выкарыстоўваецца побач з агульнавядомым эквівалентам kłomla жаночага роду.

Даследаванне праводзілася з ужываннем параўнальнага, параўнальна-гістарычнага, апісальна-аналітычнага і арэальна-тыпалагічнага метадаў. Іх комплекснае прымяненне прыводзіць да высноў аб тым, што заходнепалеска-панямонскае слова *кломля* варта трактаваць як з'яву-стымул для ўтварэння марфалагічнай інавацыі *kłomel* (f.) у паўночна-ўсходніх гаворках польскай мовы. Экспансія femininum у дадзеным выпадку можа разглядацца як вынік пераразмеркавання ў кантактнай міжславянскай і балта-славянскай зоне форм жаночага і мужчынскага роду, што ў сваю чаргу выклікала змены ў марфалогіі і адпаведныя мутацыі ў разгледжанай лексеме.

Ключавыя словы: арэал, кантактная зона, моўны ўплыў, стымул, экспансія, інавацыя

Навуковае асэнсаванне польска-беларускіх моўных кантактаў мае значную традыцыю ў славянскім мовазнаўстве, але недастаткова даследаванымі па-ранейшаму застаюцца праблемы ўзаемадзеяння паўночна-ўсходніх гаворак Польшчы з усходнеславянскім моўным арэалам, у прыватнасці, вывучэння арэальных марфалагічных інавацый[1] на паўночным усходзе Польшчы па-за межамі вузкай прыгранічнай паласы непасрэднага заходне-ўсходнеславянскага кантактавання, якія маглі быць прастымуляваны ўплывам беларускай мовы. Іх наяўнасць у вызначаных геаграфічных межах правакуе дыскусіі наконт магчымасці вылучэння агульнага беларуска-польскага моўнага ландшафту, нягледзячы на тое, што цэнтральная лакалізацыя беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў абумоўлівае кантынуацыю арэалаў пераважнай часткі беларускай лексікі на суседніх моўных тэрыторыях (Snìgìrova, 2014, s. 233), а кантактная міжмоўная балта-славянская зона[2] асабліва садзейнічае зараджэнню і пашырэнню інавацыйных з'яў.

Шматлікія сыходжанні, уласцівыя нават непасрэдна не кантактуючым паміж сабою беларускім і польскім дыялектам, дазваляюць кваліфікаваць беларуска-польскае сумежжа як зону кантактнага ўзаемадзеяння двух славянскіх арэальных масіваў, якая выяўляе тыпалагічна суадносныя, аднак у значнай ступені структурна і сэнсава адрозныя ад з'явы-стымула, інавацыі па абодва бакі моўнай мяжы.

[1] Паняцце арэальнай лінгвістыкі *інавацыя* разумеецца як новая з'ява ці заканамернасць змен у мове, якія не характэрны для яе ў мінулым і адрозніваюць яе ад першапачатковага або ранейшага стану (у супрацьпастаўленні да архаізма).

[2] Кантактная зона – зона кантактнага ўзаемадзеяння двух арэальных масіваў, у выніку якога на частцы тэрыторыі пашырэння кожнай з моў, прылягаючай да суседняй моўнай тэрыторыі, назіраецца дыфузія пэўнай колькасці з'яў ці стымуляваных імі інавацый (не атаясамліваецца з пераходнымі і (ці) змешанымі гаворкамі).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

З арэальнага пункту гледжання кожная інавацыя павінна мець свой цэнтр, з якога яна распаўсюдзілася кантактным шляхам на прылеглыя моўныя тэрыторыі. Аднак цэнтр інавацыі "не абавязкова лакалізуецца ў цэнтры арэальнай структуры пэўнага моўнага ўтварэння, часцей за ўсё, яны не супадаюць" (Cyhun, 1988, s. 23). Калі лінгвістычная з'ява прысутнічае на дзвюх сумежных тэрыторыях, то першапачатковым цэнтрам узнікнення інавацыі, хутчэй за ўсё, будзе тая тэрыторыя, дзе гэтай з'яве ўласціва больш высокая частотнасць ужывання (Serebrennikov, 1973, s. 147).

Закранаючы пытанне аб тым, дзе пэўная з'ява можа атрымаць найбольш поўнае развіццё (у цэнтры яе зараджэння ці на перыферыі), варта браць пад увагу наступнае меркаванне Генадзя А. Цыхуна:

> звычайна інавацыя не абмяжоўваецца выключна распаўсюджаннем у прасторы, а ідзе ў глыб моўнай сістэмы. Для таго, каб яна ў сваім развіцці магла ахапіць вялікую сферу ў дадзенай сістэме, неабходны значны лінгвістычны час. Трэба думаць, што больш такога часу будзе там, дзе гэта інавацыя з'явілася раней, г. зн. у цэнтры яе зараджэння (1981, s. 61).

Але часта бывае, што з'ява «перамагае» не там, дзе яна ўзнікла, а толькі вырваўшыся на каланізацыйны прастор (Trubačëv, 2004b, s. 176). Цэнтры ірадыяцыі перыферыйных інавацый размешчаны пераважна ў кантактнай (у шырокім разуменні) зоне, таму беларуска-польскае моўнае пагранічча ў гэтым аспекце ўяўляе сабой унікальны аб'ект для даследаванняў.

Марфалагічныя трансфармацыі, якія назіраюцца ў паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы, выклікаюць асаблівую цікавасць. Нягледзячы на тое, што "флектыўныя ўплывы ў міжмоўных кантактах наогул з'яўляюцца рэдкасцю" (Siatkowski, 1986, s. 558), праблема перагрупоўкі родавых форм узнікае якраз там, дзе адбываецца кантакт розных моўных сістэм. Дыялектныя асаблівасці ў функцыянаванні граматычнай катэгорыі роду, характэрныя для паўночна-ўсходніх гаворак польскай мовы, арэальна і тыпалагічна могуць быць суаднесены з адпаведнымі з'явамі, лакалізаванымі пераважна ў паўночна- і паўднёва-заходніх беларускіх гаворках – арэалы асобных назоўнікаў femininum[3] маюць працяг на ўсходзе польскага моўнага кантынуума. У прыватнасці, можна меркаваць, што цэнтр ірадыяцыі або стымул, які выклікаў узнікненне марфалагічнай інавацыі ***kłomel (f.)***, адзначанай на паўночным усходзе Польшчы, гіпатэтычна знаходзіцца на Беларусі. Супастаўляльны аналіз звестак адносна зменнай катэгорыі роду ў польскай, беларускай і некаторых іншых, славянскіх і неславянскіх, мовах, а таксама лінгвагеаграфічных, структурна-семантычных, этымалагічных дадзеных адносна гэтай арэальнай інавацыі з наяўным славянскім і неславянскім матэрыялам дазволіць наблізіцца да разгадкі яе паходжання і прычын

[3] Femininum (f.) – жаночы род (лац.).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

з'яўлення ў паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы, дзе лексема *kłomel (f.)* фармальна суадносіцца ў першую чаргу са структурай слоў мужчынскага роду і выкарыстоўваецца побач з агульнавядомым эквівалентам *kłomla* жаночага роду.

Для польскай мовы характэрна выразнае размежаванне назоўнікаў паводле прыналежнасці да катэгорыі мужчынскага або жаночага роду. Як падкрэслівае Роман Ляскоўскі, "граматычны род назоўніка з'яўляецца прыроджанай прыкметай: назоўнік як элемент лексікі з пункту погляду прыналежнасці да пэўнага граматычнага роду характарызуецца адназначна" (Laskowski, 1974, s. 117). Канчатак як вызначальны паказчык граматычнай катэгорыі роду назоўнікаў – дастаткова стабільная марфалагічная прыкмета. Аднак у гаворках, дзе адсутнічае кадыфікацыя нормы, граматычны род назоўнікаў можа вар'іравацца, у выніку чаго асобныя словы маюць варыянтныя родавыя формы з адрознымі канчаткамі.

Сярод найбольш грунтоўных прац польскіх мовазнаўцаў, прысвечаных пытанням трансфармацыі граматычнага роду ў гаворках паўночна-ўсходняй Польшчы, нельга не адзначыць манаграфію Тадэвуша Зданцэвіча *Wpływy białoruskie w polskich gwarach pod Sejnami* (Zdancewicz, 1966), а таксама атыкулы *Wpływy litewskie i wschodniosłowiańskie w gwarach polskich pod Sejnami* (Zdancewicz, 1964) і *Wahania rodzaju rzeczowników w gwarach Mazowsza i Podlasia* Дароты Крыстыны Рэмбішэўскай (Rembiszewska, 2004). Як паказваюць гэтыя і іншыя даследаванні, ваганні ў катэгорыі роду часцей закранаюць мужчынскі і жаночы род. У працэсе вызначэння граматычнага роду назоўнікаў вырашальную ролю часам можа адыгрываць іх значэнне, часам – будова, форма. Аналізуючы беларускія ўплывы ў сэйненскіх гаворках, Т. Зданцэвіч прыходзіць да высновы, што сам працэс змены граматычнага роду працякае такім чынам, што назоўнікі змяняюць род найчасцей толькі ў пэўных склонах, а дастаткова часта нават у межах аднаго склону могуць выступаць альтэрнатыўныя формы, якія адрозніваюцца родам (Zdancewicz, 1964, s. 241).

Даследчыкамі заўважана, што такія формы, як *fša*, *smaka*, маюць у сваім складзе словаўтваральны фармант *-a*, які бывае асабліва прадуктыўным пры ўтварэнні аддзеяслоўных назоўнікаў. Ва ўсіх выпадках фармант *-a* спалучае словаўтваральныя і флектыўныя функцыі (Atlas językowy Kaszubszczyzny, 1971, z. 8, cz. 2, m. 236). Канкурэнцыя канчатка *-a* як больш «фемінатыўнага»[4] паказчыка з нулявой флексіяй (ст.-польск. *wonia* і сучаснае *woń*, *szerz* // *szerza*, *tarcz* // *tarcza*) (Anan'eva, 1994, s. 146) прыводзіла да таго, што іншы род назоўніка мог захавацца ў якасці рэгіянальнага архаізма або з'явіцца як спецыфічная інавацыя ў пэўным арэале распаўсюджання польскай мовы. У тым ліку, на тэрыторыі пашырэння перыферыйных дыялектаў польскай мовы ў XIX ст. прадстаўлены

[4] Фемінатыўны – 'жаночага роду' (тут і ў тэксце). Заўвага: агульнапрынятае разуменне тэрміна "фемінатыў" як суфіксальнага дэрывата не адпавядае разглядаемай у артыкуле з'яве *kłomel (f.)*, паколькі змена роду ў дадзеным выпадку адбылася без змены марфалагічнай структуры слова.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

варыянты, якія розняцца ад нарматыўных, напрыклад *pawa* жаночага роду замест *paw*. У рэгіянальных варыянтах польскай мовы прадстаўлены ваганні ў назоўным склоне адзіночнага ліку жаночага роду паміж флексіямі *-a* і *ø*: літаратурнае *jabłoń* і перыферыйнае *jebłenia* (Anan'eva, 1994, s. 146).

Прыклады слоў так званага «дваякага роду» (у тым ліку запазычаных) фіксуюцца як ў дыялектах, дзе кажуць *ta morga*, *ten frendzel*, *ten topól* замест літаратурнага *ten mórg*, *ta frendzla*, *ta topola*, так і у літаратурнай мове: *ta chryzantema*, *cytata*, *fałda*, *zawiasa* альбо *ten chryzantem*, *cytat*, *fałd*, *zawias* (Bąk, 1997, s. 164–165). Аляксандр Брукнэр, дбаючы пра «чысціню» польскай мовы, звяртаў увагу на адаптацыю запазычаных слоў да польскай марфалагічнай сістэмы. Так, назоўнікі жаночага роду *sznura*, *dyszla*, *banka* былі заменены на лексемы мужчынскага роду: *sznur*, *dyszel*, *bank* (Brückner, 1917, s. 31). Зоф'я Курцова флексію *-a*, якая сустракаецца ў неадушаўлёных назоўніках мужчынскага роду ў назоўным склоне ў словах іншамоўнага паходжання *numera*, *dokumenta*, *finansa*, *fundusza* і ў польскіх словах *cienia*, *płomienia*, *urzęda*, *wąsa*, трактуе як паўднёва-перыферыйны марфалагічны архаізм, які пачынае знікаць з літаратурнай мовы з канца XIX ст. (Kurzowa, 1993, s. 37–38). Гэтак жа інтэрпрэтуецца даследчыцай факт захавання старога граматычнага роду некаторых неадушаўлёных назоўнікаў: *ten kometa, planeta, zachęt, ta cień, mozoła, pierwiosnka, to album, cudo, fortepiano* (у той час, калі ў літаратурнай мове іх род памяняўся на адпаведны сучаснаму на працягу XIX ст.), а таксама ваганні канчаткаў назоўнікаў жаночага роду: *łodzia // łódź, łań // łani // łania, topól // topola, tarcz // tarcza*, вядомыя старой польскай мове і сённяшнім гаворкам (1993, s. 43). Разам з тым менавіта беларускім уплывам на марфалогію ўсходняй перыферыйнай пальшчызны З. Курцова тлумачыць іншы ў параўнанні з польскай мовай граматычны род слоў *recept, metod, ten kieszeń, kantora, krama, ptaszka, ta piec, cień* і пераход пад уплывам акання назоўнікаў ніякага роду з канчаткамі *-o, -e, -ę* ў назоўнікі жаночага роду: *ta okna, wiadra, ta pola, ta zadania, do czółny, łóżi, okny* (1993, s. 45–46).

З гісторыі нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы вядома, што "ваганні ў родзе насілі несістэматычны характар і абумоўлены, у першую чаргу, адсутнасцю граматычнай нормы і ўплывам жывой гутарковай мовы" (Lemcûgova, 2005, s. 160). Да прыкладу, сярод граматычных форм роду на старонках газеты „Наша Ніва" выяўляюцца: *акцыз – акцыза, амбон – амбона, бутыль – бутля, жаваранак – жаваранка, капыт – капыта, клас (кляс) – кляса, лішак – лішка, неспадзевак – неспадзеўка, прадажа – продаж, прастор – прастора* і інш. (Lemcûgova, 2005, s. 160). З пункту гледжання марфалогіі, змешванне ў родзе звычайна звязана з хістаннямі граматычнай катэгорыі роду. Паводле меркавання Яўхіма Ф. Карскага, такія формы, як *вёрст, плат, купель, тень, печь, двер, постель, нутрь, боль, жаль, далонь, мазоль, твар* і інш. утварыліся у выніку ўплыву адных асноў на іншыя і змешвання іх (Karskij, 2006, s. 314). Часам, што нечакана, натуральны пол не аказваў уплыву на ўжыванне неадпаведнага роду, асабліва гэта датычыцца слоў на *-a* (*судзьдзя, староста, п'яніца, нядбайліца*), але з іншага боку, даклад-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

нае ўяўленне палавых адрозненняў было прычынай таго, што народ у падобных выпадках мяняў аснову і нават канчаткі назоўнага склону (Karskij, 2006, s. 315).

Прыналежнасць неадушаўлёных назоўнікаў да якога-небудзь роду можна патлумачыць моўнай традыцыяй. Акрамя таго, род назоўніка ўтрымліваецца пэўнымі прыкметамі, характэрнымі для яго. Сярод такіх прыкмет – лексічная, марфалагічная і сінтаксічная (Lemcûgova, 2005, s. 153). Гэта значыць, што адпаведнасць назоўнікаў таму ці іншаму роду вызначаецца лексічным значэннем слоў, характарам асновы і склонавымі канчаткамі ў розных тыпах скланення, а таксама сінтаксічнымі сувязямі (Atrahovič, Bulahaŭ, 1962, t. 1, s. 30). Звычайна фармальныя паказчыкі замацоўваюцца за канкрэтным родам пад уплывам адушаўлёных назоўнікаў, у якіх відавочна выступае сувязь з натуральным полам і якія маюць тыя ж фармальныя прыкметы, што і неадушаўлёныя назоўнікі (Lemcûgova, 2005, s. 153). Як сцвярджае Валянціна П. Лемцюгова,

> родаадрознівальныя марфемы (канчаткі, суфіксы) выпрацоўваліся і замацоўваліся за назоўнікамі кожнага граматычнага роду на працягу стагоддзяў. Але стабільнасць граматычнага роду ні ў якім разе не выключае пэўных змен, пад якія падпадала гэтая граматычная катэгорыя на працягу ўсяго перыяду развіцця мовы. У цэлым гэтыя змены закранулі родавую класіфікацыю неістотна і праявіліся, напрыклад, у пераходзе некаторых назоўнікаў з адной родавай формы ў другую. На сінхранічным зрэзе звычайна назіраецца адначасовае ўжыванне розных родавых форм назоўнікаў (2005, s. 154).

Параўн. ваганні ў катэгорыі роду, адзначаныя ў *Граматыцы беларускай мовы* 1962 г., дзе вылучалася невялікая група назоўнікаў *(замш – замша, клавіш – клавіша, зал – зала, салат – салата, прастор – прастора, ціш – ціша)*, якія "захоўваючы адзінства лексічнага значэння, не маюць устойлівых форм і адпаведна значэння роду" (Atrahovič, Bulahaŭ, 1962, t. 1, s. 37), паколькі ўжываюцца звычайна ў форме і значэнні мужчынскага роду, але побач з гэтым могуць афармляцца і на ўзор слоў жаночага роду.

Згодна з картаграфаванымі дадзенымі, арэал, утвораны ***ізаморфай kłomel*** *(f.)* 'род сеткі (невад)', фармальна астраўны, несуцэльны і невялікі па памерах (гл. карту-схему)[5]. Слова жаночага роду *kl'oml'ь* са значэннем 'kłomla' таксама занатавана ў слоўніку мовы стараверaў, паводле якога распаўсюджана на Мазурах, у Сувалкаўскім, Сэйненскім і Аўгустоўскім паветах (Grek-Pabisowa, Maryniakowa, 1980, s. 118).

[5] Карта-схема – спрошчаная, безмаштабная карта для ілюстрацыі арэальнага малюнка, якая не прадугледжвае аднаўлення дэталёвага лінгвагеаграфічнага размеркавання даследуемых з'яў. Арэал акрэслены па крайніх пунктах паводле: Kowalska, 1975, t. 1, cz. 1, m. 89. Граніца максімальнага распаўсюджання ўсходнеславянскіх гаворак вызначана паводле: Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny, 1980, t. 1, s. 123.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

Семантыку лексічнай адзінкі *kłomel* падрабязна тлумачыць Ян Карловіч: “сетка для лоўлі рыбы і ракаў у выглядзе мяшка, расшпіленага на дузе ў форме літары D, на трох кіях, якія ідуць да дна мяшка, і асаджаная на некалькі локцяў доўгай жэрдкай” (1900, t. 2, s. 377–378).

Лексема жаночага роду *kłomel* зафіксавана ў паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы паралельна з больш распаўсюджанай назвай *kłomla*, якая мае тое ж самае значэнне (‘рыбалоўная сетка, нацягнутая на драўляны трохвугольны каркас’) або падобнае (параўн. падляшскае *kłomla* ‘піраміда з трохвугольнай асновай, абцягнутая рыбалоўнай сеткай’ (Maryniakowa, 2011, s. 35)) і ўтварае адкрыты на ўсход арэал. Родавыя варыянты *kłomel* і *kłomla* як семантычныя дублеты адрозніваюцца толькі граматычна (функцыянальна). Агульнасць арэала *kłomla* з усходнеславянскай тэрыторыяй пацвярджаецца матэрыяламі *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак*, дзе сярод назваў рыбалоўнай крыгі ёсць *кломля*, *клумля*, *кломня*, *клумня*, *кловня*, *комля*, *комла*, *кімля*, *комяль*, лакалізаваныя галоўным чынам у паўднёва-заходняй і паўднёва-цэнтральнай частцы Беларусі (Leksìčny atlas belaruskìh narodnyh gavorak, t. 1, m. 332), а таксама многімі іншымі лінгвагеаграфічнымі і лексікаграфічнымі крыніцамі (Mackevìč, 1979, t. 2, s. 478; Alâhnovìč, 1989, s. 97; Šatalava, 1975, s. 81; Ramanovìč, 1977, s. 131; Uscìnovìč, 1992, s. 109; Čygryn, 1992, s. 127; Scâcko, Pavel, 2005, s. 61; Bykava, 1992, s. 180–181; Filin, 1965, t. 13, s. 303). Ізалекса *кломля* інтэрпрэтуецца як «сепаратная» заходнепалеска-панямонская (Klìmčuk, Âškìn, 1995, s. 192). Той факт, што ў гаворках заходняга і цэнтральнага Палесся пераважаюць найменні *кломля* і падобныя, а ў астатніх гаворках часцей ужываецца слова *крыга*, звязаны з умовамі рыбнай лоўлі ў палескім рэгіёне і немагчымасцю выкарыстання тут іншай прылады. Храналагічна пашырэнне лексемы *кломля* адбылося пазней (*крыга* адзначаецца на пач. XVI ст., *кломля* (*комля*) – у сяр. XVII ст.) (Bykava, 1992, s. 180–181).

Назоўнікі жаночага роду *кломля* і *kłomel* маюць розную словаўтваральную структуру ў беларускіх і польскіх дыялектах. Неабходна заўважыць, што ў беларускай мове неасабовыя назоўнікі з суфіксам *-ель*, якія абазначаюць прадметы на аснове асацыяцыі з тым, што названа ўтваральным словам (*крыгель*, *кашэль*, *зубель*...), складаюць рэгіянальны (Брэсцкая, Гомельская, Гродзенская вобласці), непрадуктыўны тып словаўтварэння (Scâcko, 1977, s. 152). Суфікс *-ель* лічыцца роднасным да ст.-прус. *-elis*, *-ẽlis* (Cyhun, 1978, t. 4, s. 221), што, у сваю чаргу, імаверна звязана з мовай яцвяжскага насельніцтва, якое мела дачыненне да даследуемай тэрыторыі. Наяўнасць фарманта *-el* замест *-la* ў структуры марфалагічнай інавацыі можа быць патлумачана гэтым фактарам.

Ваганні ў вызначэнні роду назоўнікаў канстатуюцца і ў паўночных рускіх гаворках (*стебель*, *вязель* і інш. мужчынскага і жаночага роду) (Azarh, 1985, s. 180), што таксама магло паслужыць узорам для ўзнікнення варыянтаў ад назвы *кломля* з розным граматычным родам у зоне ўсходнеславянскіх гаворак. Згодна з думкай Францішка Слаўскага, формы з каранёвым *n*, хутчэй за ўсё, утварыліся ў выніку

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

ад'ідэацыі да дзеяслова *kloniti*, польск. *kłonić* (Atlas językowy Kaszubszczyzny, t. 8, cz. 2. s. 68). Іх першыя запісы датуюцца XIII ст., прычым формы з каранёвым *m* знойдуцца ў беларускіх і ўкраінскіх дыялектах. На ўсходнім паграніччы Польшчы, на паўночным Мазоўшы, Варміі, Мазурах, Куявах і інш. землях выяўлены лексемы ў форме *kłomka*, *kłomnia*, у той час як *kłoń*, *kłonia* – на Мазоўшы, Варміі, Мазурах і ў Вялікапольшчы (Atlas językowy Kaszubszczyzny, t. 8, cz. 2. s. 68). Зыходзячы з гэтага, можна меркаваць, што структура слова *kłomel* фарміравалася пад уплывам усходнеславянскага суседства. Улічваючы тое, што ў беларускай мове, як і ў "іншых усходнеславянскіх мовах у якасці асновы і адпраўнога пункта родавых адрозненняў звычайна выступае мужчынскі род" (Lemcûgova, 2005, s. 155), вылучаная гіпотэза можа знайсці пацвярджэнне.

Як вядома, граматычная катэгорыя роду з'яўляецца класіфікуючай для назоўнікаў, аднак родавая прыналежнасць назоўнікаў магла змяняцца на працягу гістарычнага развіцця мовы. Верагодна, у дадзеным выпадку трансфармацыя роду лексемы *kłomel* адбылася ў сувязі з «зацемненасцю» семантыкі і франтальнай экспансіяй назвы жаночага роду *kłomla*. Пазней, мабыць, у працэс нараджэння марфалагічнай інавацыі ўключыліся асацыятыўныя сувязі з паняццем 'сетка'. Ніводная лексема з суседніх моў і дыялектаў, якой называецца рыбалоўная крыга, акрамя *kłomel*, не мае такой выразнай, на першы погляд, прыметы мужчынскага роду, як суфікс *-el*. Структурна ўсе іншыя аднакарэнныя словы адносяцца да катэгорыі назоўнікаў жаночага роду. Мар'я Карплюк, разглядаючы ў запазычаннях ваганні катэгорыі роду, адзначае, што змена роду магла быць выклікана фармальным чыннікам: запазычанні на *-el*, як правіла, былі мужчынскага роду (Karpluk, 1974, s. 241–242). Параўн.: лексема *kǫmęl* мужчынскага роду ў кнышыньскіх гаворках вядома ў значэнні 'ніжні канец расліны' і 'больш тоўсты канец, напрыклад, галіны' (Rembiszewska, 2007, s. 156). Таму можна дапускаць, што слова *kłomel*, нягледзячы на структуру з выразным паказчыкам маскулінатыва *-el*, утварылася і пачало функцыянаваць па агульнапрынятай схеме. Такім чынам мог паўплываць існуючы эквівалент жаночага роду, на што ўказвае арэальны малюнак з'явы. У ваганнях *kłonia – kłomel* заўважаецца паслядоўнасць (лагічнасць) прыняцця польскімі гаворкамі першаснага жаночага роду архетыпа **kłomьnja*: паводле *Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы*, адпаведна аб'ядноўваюцца паралелі ўкр. *кімля*, *климля*, *кломля*, руск. (зах.) *кломля* 'тс', сб.-х. *клőња* 'пастка для птушак', славен. *klônja* 'тс', польск. *kłomia*, *kłonia* 'тс', славац. *kłonia* 'кошык для квахтухі' (Cyhun, 1978, t. 5, s. 64). На думку Тадэвуша Зданцэвіча, які прысвяціў вывучэнню беларускіх ўплываў у паўночна-ўсходніх гаворках польскай мовы асобую ўвагу, эпентычны *l* у слове *kłomla* 'рыбалоўная сетка ў выглядзе трохвугольнага конуса на доўгай палцы' варта лічыць адным з нешматлікіх прыкладаў захавання эпентэзы на польскім грунце (Zdancewicz, 1966, s. 75).

Пераарыентацыя на жаночы род у гаворках можа адбывацца пад уплывам некалькіх фактараў. Заканамерна, што адсутнасць ў гаворках кадыфікаванай нормы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

садзейнічае ўзнікненню родавых варыянтаў з мадыфікацыйнымі паказчыкамі жаночасці / мужчынскасці. Марфалагічнае вар'іраванне выяўляе змены ў галіне прадуктыўнасці флексійна-словаўтваральнага элемента *-а* пры ўтварэнні назоўнікаў жаночага роду ў паўночна-ўсходніх гаворках польскай мовы (у межах адной моўнай сістэмы, аднаго рэгіёна і аднаго сінхроннага зрэзу).

Пошукі цэнтраў ірадыяцыі інавацый падчас правядзення спецыяльных даследаванняў часта звязаны з пераадоленнем вялікіх цяжкасцей. Крытэрый распаўсюджанасці слоў заўсёды ўплывае на вынік этымалогіі; абмежаваная распаўсюджанасць слова вельмі часта выступае прыкметай запазычання з іншай мовы (Trubačëv, 2004a, s. 225). Разам з тым у кожнай інавацыі, якая ахапіла некалькі моў, абавязкова прысутнічае элемент запазычання (Trubačëv, 2004a, s. 234). Праведзены аналіз фактычнага матэрыялу пацвярджае тэзіс аб тым, што часам у гаворках пэўныя тыпы марфалагічных трансфармацый больш блізкія суседнім мовам, чым роднай літаратурнай мове (Astrėjka, 1997). Цэнтр ірадыяцыі ці стымул для ўзнікнення і экспансіі назоўніка *kłomel (f.)* як марфалагічнай паўночна-ўсходняй арэальнай інавацыі ў польскай мове лакалізуецца на беларускай тэрыторыі, у зоне пашырэння палескіх гаворак, паколькі менавіта тут распаўсюджана найбольшая колькасць аднакарэнных лексем жаночага роду. Такім чынам, заходнепалеска-панямонскае слова *кломля* варта трактаваць як з'яву-стымул для ўтварэння марфалагічнай інавацыі *kłomel (f.)* у паўночна-ўсходніх гаворках польскай мовы. Экспансія ў паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы femininum можа разглядацца як вынік пераразмеркавання ў кантактнай міжславянскай і балта-славянскай зоне форм жаночага і мужчынскага роду, што ў сваю чаргу выклікала змены ў марфалогіі і адпаведныя мутацыі ў разгледжанай лексеме. Нягледзячы на тое, што звычайна ўнутрыструктурныя дыялектныя асаблівасці больш трывалыя і стабільныя ў параўнанні з фанетычнымі і лексіка-семантычнымі, арэал прааналізаванай марфалагічнай інавацыі мае працяг на ўсходзе польскага моўнага кантынуума. Ізаморфа *kłomel (f.)* ўтварае поле інтэнсіўнага ўзаемадзеяння з беларускімі гаворкамі і характарызуе марфалагічную сістэму паўночна-ўсходніх гаворак польскай мовы як адкрытую.

Прынятыя скарачэнні

зах. – заходняе
лац. – лацінскае
польск. – польскае
руск. – рускае
сб.-х. – сербахарвацкае
славац. – славацкае
славен. – славенскае

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

ст.-польск. – старажытнапольскае
ст.-прус. – старажытнапрускае
укр. – украінскае



Карта-схема

граніца максімальнага распаўсюджання ўсходнеславянскіх гаворак

kłomel (f.)

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Sources / Źródła

Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny. T. 1. (1980). Wrocław [etc.]: Zakł. Nar. im. Ossolińskich. (Prace slawistyczne, 14).

Atlas językowy Kaszubszczyzny i dialektów sąsiednich: w 15 z. (1964–1978). Pod kier. Z. Stiebiera. Wrocław [etc.]: Zakł. Nar. im. Ossolińskich.

Kowalska, Anna. (1975–1979). *Zróżnicowanie słowotwórcze gwar Mazowsza i Podlasia: rzeczownik* w 2 t. Wrocław [etc.]: Zakł. Nar. im. Ossolińskich.

Leksìčny atlas belaruskih narodnyh gavorak u 5 t. (1993–1998). M. Bìryla (gal. rèd.) [ì ìnš.]. Mìnsk: Fond fundam. dasled. Rèp. Belarus‘. [*Лексічны атлас беларускіх народных гаворак* у 5 т. (1993–1998). М. Бірыла (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Фонд фундам. даслед. Рэсп. Беларусь].

Studies / Opracowania

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

Alâhnovìč, Mìkalaj (sklad.) [ì ìnš.]. (1989). *Dyâlektny sloŭnìk Brèstčyny.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Аляхновіч, Мікалай (склад.) [і інш.]. (1989). *Дыялектны слоўнік Брэстчыны.* Мінск: Навука і тэхніка].

Anan'eva, Natal'â. (1994). *Istoriâ i dialektologiâ pol'skogo âzyka: učeb. posobie dlâ studentov vuzov*. Moskva: Izd-vo Mosk. un-ta. [Ананьева, Наталья. (1994). *История и диалектология польского языка: учеб. пособие для студентов вузов.* Москва: Изд-во Моск. ун-та].

Astrèjka, Vera. (1997). *Paŭnočna-zahodnââ zanal'naâ leksìka ŭ najmennâh zâŭ žyvoj pryrody (lìngvageagrafiâ ì pahodžanne): aŭtarèf. dys. ... kand. filal. navuk: 10.02.01*. Mìnsk: NAN Belarusì, Ìn-t movaznaŭstva ìmâ Â. Kolasa. [Астрэйка, Вера. (1997). *Паўночна-заходняя занальная лексіка ў найменнях з'яў жывой прыроды (лінгвагеаграфія і паходжанне): аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.01.* Мінск: НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа].

Atrahovič, Kandrat (Kandrat Krapìva), Bulahaŭ, Mìhaìl. (1962). *Gramatyka belaruskaj movy: u 2 t.* Mìnsk: Vyd-va AN BSSR. [Атраховіч, Кандрат (Кандрат Крапіва), Булахаў, Міхаіл. (1962). *Граматыка беларускай мовы: у 2 т.* Мінск: Выд-ва АН БССР].

Azarh, Juliâ. (1985). Morfologičeskie varianty proizvodnyh sušestvitel'nyh v russkih govorah. W: Valerij Ivanov (red.). *Obŝeslavânskij lingvističeskij atlas: materialy i issled., 1982* (s. 177–197). Moskva: Nauka. [Азарх, Юлия. (1985). Морфологические варианты производных существительных в русских говорах. В: Валерий Иванов (ред.). *Общеславянский лингвистический атлас: материалы и исслед., 1982* (с. 177–197). Москва: Наука].

Bąk, Piotr. (1997). *Gramatyka języka polskiego.* Warszawa: Wiedza Powszechna.

Brückner, Aleksander. (1917). *Walka o język.* Lwów: Książnica Pol. T-wa Nauczycieli Szkół Wyższych we Lwowie.

Bykava, Natallâ. (1992). Leksemy inšamoŭnaga pahodžannâ ŭ nazvah žyvёĺnaga svetu. U: Pavel Mìhajlaŭ, Ìvan Âškìn (rèd.). *Žyvoe narodnae slova: dyâlektalagìčny zbornìk* (s. 177–200). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Быкава, Наталля. (1992). Лексемы іншамоўнага паходжання ў назвах жывёльнага свету. У: Павел Міхайлаў, Іван Яшкін (рэд.). *Жывое народнае слова: дыялекталагічны зборнік* (с. 177–200). Мінск: Навука і тэхніка].

Čygryn, Ìvan. (1992). Âščè raz z našaj leksìkì (vëska Čamâry, Slonìmskì raën). U: Pavel Mìhajlaŭ, Ìvan Âškìn (rèd.). *Žyvoe narodnae slova: dyâlektalagìčny zbornìk* (s. 123–131). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Чыгрын, Іван. (1992). Яшчэ раз з нашай лексікі (вёска Чамяры, Слонімскі раён). У: Павел Міхайлаў, Іван Яшкін (рэд.). *Жывое народнае слова: дыялекталагічны зборнік* (с. 123–131). Мінск: Навука і тэхніка].

Cyhun, Genadz' (rèd.). (1978–.). *Ètymalagìčny sloŭnìk belaruskaj movy.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Цыхун, Генадзь (рэд.). (1978–.). *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы.* Мінск: Навука і тэхніка].

Cyhun, Genadz'. (1981). Slavânskìâ prynaležnyâ kanstrukcyì z zajmennìkavaj klìtykaj (Da metodykì vyznačènnâ ìnavacyj). *Belaruskaâ Lìngvìstyka*, 20, s. 56–62. [Цыхун, Генадзь. (1981). Славянскія прыналежныя канструкцыі з займеннікавай клітыкай (Да методыкі вызначэння інавацый). *Беларуская Лінгвістыка*, 20, с. 56–62].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

Cyhun, Genadz'. (1988). *Arèal'naâ typalogiâ slavânskih moŭ: pryncypy i napramkì dasledavannâ.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Цыхун, Генадзь. (1988). *Арэальная тыпалогія славянскіх моў: прынцыпы і напрамкі даследавання.* Мінск: Навука і тэхніка].

Filin, Fedot (red.). (1965–.). *Slovar' russkih narodnyh govorov*. Moskva; Leningrad: Nauka. [Филин, Федот (ред.). (1965–.). *Словарь русских народных говоров*. Москва; Ленинград: Наука].

Grek-Pabisowa, Iryda; Maryniakowa, Irena. (1980). *Słownik gwary starowierców mieszkających w Polsce.* Wrocław–Warszawa: Zakład Narodowy im. Ossolińskich – Wydawnictwo PAN.

Karłowicz, Jan. (1900–1911). *Słownik gwar polskich* w 6 t. Kraków: Akad. Umiejętności.

Karpluk, Maria. (1974). Wahania rodzaju gramatycznego zapożyczeń pod wpływem wyrazów bliskoznacznych (na przykładzie pol. chomąto, dyszel). W: J. Kuryłowicz i in. (red.). *Prace Komisji Językoznawstwa,* 37: *Studia indoeuropejskie. Études indo-européennes. Ioanni Safarewicz septuagenario ab amicis collegis sodalibus animo oblatum gratissimo* (s. 87–90). Kraków.

Karskij, Efim. (2006). *Belorusy* v 3 t. T. 2, kn. 2: *Âzyk belorusskogo naroda.* Minsk: BelÈn. [Карский, Ефим. (2006). *Белорусы* в 3 т. Т. 2, кн. 2: *Язык белорусского народа.* Минск: БелЭн.].

Klìmčuk, Fëdar, Âškìn, Ìvan (rèd.). (1995). *Leksìčnyâ landšafty Belarusì: Žyvël'ny svet.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Фёдар Клімчук, Іван Яшкін (рэд.). (1995). *Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет.* Мінск: Навука і тэхніка].

Kurzowa, Zofia. *O mowie Polaków na Kresach wschodnich.* (1993). Kraków: Secesja.

Laskowski, Roman. (1974). Rodzaj gramatyczny, struktura głęboka a zaimki osobowe, W: J. Kuryłowicz i in. (red.). *Prace Komisji Językoznawstwa,* 37: *Studia indoeuropejskie. Études indo-européennes. Ioanni Safarewicz septuagenario ab amicis collegis sodalibus animo oblatum gratissimo* (s. 117–124). Kraków.

Lemcûgova, Valâncìna (rèd.) [ì ìnš.]. (2005). *Mova «Našaj nìvy» (1906–1915). Varyântnasc'. Sìnanìmìâ.* Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Лемцюгова, Валянціна (рэд.) [і інш.]. (2005). *Мова «Нашай нівы» (1906–1915). Варыянтнасць. Сінанімія.* Мінск: Беларуская навука].

Mackevìč, Ûzèfa. (rèd.). (1979–1986). *Sloŭnìk belaruskìh gavorak paŭnočna-zahodnâj Belarusì ì âe pagranìčča* u 5 t. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Мацкевіч, Юзэфа. (рэд.). (1979–1986). *Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча* у 5 т. Мінск: Навука і тэхніка].

Maryniakowa, Irena. *Słownik dawnej mowy mieszkańców Ciechanowca i okolicznych wsi na Podlasiu.* (2011). Łomża: Łomżyńskie Towarzystwo Naukowe im. Wagów.

Ramanovìč, Âŭgenìâ. (1977). Leksìka lel'čyckaj gavorkì. U: Alâksandr Kryvìckì, Ûzèfa Mackevìč (rèd.). *Narodnaâ leksìka* (s. 130–134). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Рамановіч, Яўгенія. (1977). Лексіка лельчыцкай гаворкі. У: Аляксандр Крывіцкі, Юзэфа Мацкевіч (рэд.). *Народная лексіка* (с. 130–134). Мінск: Навука і тэхніка].

Rembiszewska, Dorota. (2004). Wahania rodzaju rzeczowników w gwarach Mazowsza i Podlasia. W: *Prace Filologiczne*, 49 (s. 417–426). Warszawa.

Rembiszewska, Dorota. *Słownik dialektu knyszyńskiego Czesława Kudzinowskiego.* (2007). Łomża: Łomżyńskie Towarzystwo Naukowe im. Wagów.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

Šatalava, Lûboŭ. (1975). *Belaruskae dyâlektnae slova.* Rèd. Ganna Arašonkava. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Шаталава, Любоў. (1975). *Беларускае дыялектнае слова.* Рэд. Ганна Арашонкава. Мінск: Навука і тэхніка].

Scâcko, Pavel. (1977). *Belaruskae narodnae slovaŭtvarènne: afiksal'nyâ nazoŭnìkì.* Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Сцяцко, Павел. (1977). *Беларускае народнае словаўтварэнне: афіксальныя назоўнікі.* Мінск: Навука і тэхніка].

Scâcko, Pavel. (2005). *Sloŭnìk narodnaj movy Zèl'venščyny: kalâ 3000 sloŭ.* Grodna: GrDU. [Сцяцко, Павел. (2005). *Слоўнік народнай мовы Зэльвеншчыны: каля 3000 слоў.* Гродна: ГрДУ].

Serebrennikov, Boris (red.). (1973.) *Obŝee âzykoznanie: metody lingvističeskih issledovanij.* Moskva: Nauka. [Серебренников, Борис (ред.). (1973.) *Общее языкознание: методы лингвистических исследований.* Москва: Наука].

Siatkowski, Janusz. (1986). Kryteria ustalania wpływu języków bliskispokrewnionych. W: *Festschrift für Herbert Bräuer zum 65. Geburtstag am 14. April 1986*, Köln–Wien (s. 551–563).

Snìgìrova, Natallâ. (2014). Sacyâlìngvistyčnyâ ŭmovy farmìravannâ belaruska-poĺskaj arèaĺnaj supoĺnascì. *Acta Albaruthenica*, 14, s. 233–242. [Снігірова, Наталля. (2014). Сацыялінгвістычныя ўмовы фарміравання беларуска-польскай арэальнай супольнасці. *Acta Albaruthenica*, 14, с. 233–242].

Trubačëv, Oleg. (2004a). Lingvističeskaâ geografiâ i ètimologičeskie issledovaniâ. W: *Trudy po ètimologii: slovo, istoriâ, kul'tura* v 2 t. (s. 211–239). Moskva: Âzyki slavânskoj kul'tury. [Трубачёв, Олег. (2004). Лингвистическая география и этимологические исследования. В: *Труды по этимологии: слово, история, культура* в 2 т. (с. 211–239). Москва: Языки славянской культуры].

Trubačëv, Oleg. (2004b). Slavânskaâ filologiâ i sravnitel'nost'. Ot s"ezda k s"ezdu. W: *Trudy po ètimologii: slovo, istoriâ, kul'tura* v 2 t. (s. 154–188). Moskva: Âzyki slavânskoj kul'tury. [Трубачёв, Олег. (2004). Славянская филология и сравнительность. От съезда к съезду. В: *Труды по этимологии: слово, история, культура* в 2 т. (с. 154–188). Москва: Языки славянской культуры].

Uscìnovič, Ganna. (1992). Da sloŭnìka Navagrudčyny. U: Pavel Mìhajlaŭ, Ìvan Âškìn (rèd.). *Žyvoe narodnae slova: dyâlektalagìčny zbornìk* (s. 105–114). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Усціновіч, Ганна. (1992). Да слоўніка Навагрудчыны. У: Павел Міхайлаў, Іван Яшкін (рэд.). *Жывое народнае слова: дыялекталагічны зборнік* (с. 105–114). Мінск: Навука і тэхніка.

Zdancewicz, Tadeusz. (1964). Wpływy litewskie i wschodniosłowiańskie w gwarach polskich pod Sejnami. *Acta Baltico-Slavica*, 1, s. 227–246.

Zdancewicz, Tadeusz. *Wpływy białoruskie w polskich gwarach pod Sejnami.* (1966). Poznań: Poznańskie Towarzystwo Przyjaciół nauk.

SUBMITTED: 30.06.2022
ACCEPTED: 13.09.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 11/09/2026 00:58:39

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Natalia Snigiriova / Наталля Снігірова – Białoruś, Mińsk, Narodowa Akademia Nauk Białorusi, Państwowa Instytucja Naukowa „Centrum Badań Kultury, Języka i Literatury Białoruskiej Narodowej Akademii Nauk Białorusi"; dr, doc.; spec.: językoznawstwo słowiańskie; zainteresowania naukowe: polonistyka, dialektologia słowiańska (głównie pogranicze polsko-białoruskie i bałto-słowiańskie), lingwistyka arealna, leksykografia.

Adres: Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа, Рэспубліка Беларусь, 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2.

Wybrane publikacje:

1. Снігірова, Наталля. (2019). Традыцыі і трансфармацыі этнамоўнай самаідэнтыфікацыі носьбітаў сучасных беларускіх гаворак Беласточчыны: з вопыту назірання і асэнсавання (Tradycje i transformacje samoidentyfikacji etnicznej i językowej nosicieli współczesnych gwar białoruskich Białostocczyzny. Z doświadczeń obserwacji i pojmowania). W: Bazyli Siegień (red.). *Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe.* T. 20: *Materiały XXV Międzynarodowej Konferencji Naukowej "Droga ku wzajemności" (Białystok, 18–19.10.2019)* (s. 255–267). Białystok: Drukarnia Sochor.
2. Снігірова, Наталля. (2018). Моўныя ўплывы ў паўночнаславянска-балцкай кантактнай зоне. W: Аляксандр Лукашанец (рэд.). *Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фальклярыстыка: XVI Міжнародны з'езд славістаў (Бялград, 20–27 жніўня 2018): дакл. беларус. дэлегацыі.* (с. 205–217). Мінск: Беларуская навука.
3. Снігірова, Наталля. (2016). Намінатыўна-ацэначныя феномены ў паўночна-ўсходніх гаворках польскай мовы: да пытання аб міжмоўных польска-беларускіх карэляцыях. *Studia wschodniosłowiańskie*, 16, s. 315–323.
4. Снігірова, Наталля. (2016). Ізалексы польска-беларускай кантактнай зоны: з вопыту арэальнай інтэрпрэтацыі назоўнікавых утварэнняў з фармантам -uk/-iuk. W: Вераніка Курцова [і інш.] (рэд.). *Беларуска-польскія культурна-моўныя ўзаемадачыненні: ад гісторыі да сучаснасці / Białorusko-polskie stosunki kulturowo-językowe: historia i współczesność: зб. навук. арт.* (с. 233–249). Мінск: Беларуская навука.
5. Снігірова, Наталля. (2014). Асаблівасці сацыялінгвістычнай сітуацыі ў камунікатыўнай прасторы кантактнай зоны Беларусі і Польшчы (гістарычны аспект). *Socjolingwistyka*, 28, s. 109–120.